# СПРЭЧКІ ПА СПРАВАЗДАЧАХ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КП БЕЛАРУСІ І РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ КПБ

## *Прамова І. Я. ПАЛЯКОВА*

**(Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР)**

Таварышы дэлегаты!

У справаздачным дакладзе нашаму з'езду кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі таварыш Ц. Я. Кісялёў даў усебаковую характарыстыку дзейнасці рэспубліканскай партыйнай арганізацыі пасля XXV з'езда КПСС. Штодзённая арганізатарская, палітычная і выхаваўчая работа партыйных органаў, усіх камуністаў знайшла сваё ўвасабленне ў далейшым росце эканамічнага патэнцыялу рэспублікі, павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа. Гэта яшчэ адно пераканаўчае сведчанне правільнасці эканамічнай стратэгіі Камуністычнай партыі, мудрасці яе ўнутранай і знешняй палітыкі.

Рашэнні XXV з'езда, Пленумаў ЦК КПСС служылі ў справаздачным перыядзе надзейным арыенцірам для дзейнасці нашых прадстаўнічых органаў улады — Саветаў народных дэпутатаў. У поўнай адпаведнасці з імі накіроўвалі работу Саветаў рэспублікі Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, абласныя і іншыя кіруючыя партыйныя органы. Прадметам іх пастаяннай увагі былі і застаюцца пытанні падбору савецкіх кадраў, выхавання савецкіх работнікаў, дэпутатаў у духу адказнага, творчага падыходу да вырашэння народнагаспадарчых і сацыяльных задач, клопаты аб павышэнні іх палітычнай сталасці і дзелавой кваліфікацыі.

Шмат намаганняў па партыйнай лініі прыкладаецца да ўдасканалення стылю і метадаў савецкай работы. Дзейсны ўплыў на павышэнне яе ўзроўню зрабіла, напрыклад, абмеркаванне ў Бюро ЦК КПБ пытання аб партыйным кіраўніцтве Саветамі ў Віцебскай вобласці. Розныя бакі дзейнасці савецкіх органаў рэгулярна разглядаюцца абласнымі, гарадскімі, раённымі камітэтамі партыі, што садзейнічае развіццю іх ініцыятывы і ўзмацненню ўплыву на гаспадарчае, грамадскае і культурнае жыццё.

Палітыка партыі, вызначаная XXV з'ездам, знайшла сваё праламленне ва ўсёй шматграннай дзейнасці Саветаў рэспублікі. Але асабліва хацелася б падкрэсліць, што ўзмацнілася іх увага да эканомікі, вузлавых праблем кіравання народнай гаспадаркай. Іменна гэтыя пытанні пераважаюць у парадку дня сесій Саветаў, пасяджэнняў выканкомаў, пастаянных камісій. Яны складаюць таксама асноўны змест арганізатарскай работы савецкага апарату, дэпутатаў. Нам трэба замацаваць гэты якасны зрух, які вызначыўся ў дзесятай пяцігодцы, дабівацца, каб і далей павышалася роля Саветаў у гаспадарчым будаўніцтве.

Народнагаспадарчая праграма пяцігодкі, кантроль за яе ажыццяўленнем знаходзіліся ў цэнтры ўвагі Вярхоўнага Савета БССР, яго Прэзідыума, пастаянных камісій. Пры разглядзе планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця, бюджэту і вынікаў іх выканання Вярхоўны Савет нацэльваў рэспубліканскія і мясцовыя савецкія і гаспадарчыя органы на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, паляпшэнне якасных паказчыкаў.

Важнае месца ў дзейнасці Вярхоўнага Савета і яго органаў займалі пытанні дзяржаўнага будаўніцтва, павышэння дабрабыту працоўных, выканання наказаў выбаршчыкаў, кіраўніцтва мясцовымі Саветамі. Гістарычнай падзеяй у жыцці рэспублікі было прыняцце ў 1978 годзе новай Канстытуцыі Беларускай ССР. Распрацаваная ў адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1977 года, яна ўвабрала ў сябе галоўныя палажэнні савецкай сацыялістычнай дзяржаўнасці, у канцэнтраваным выглядзе адлюстравала слаўны шлях, пройдзены беларускім народам у сям'і брацкіх народаў нашай Радзімы. Былі прыняты таксама законы аб Савеце Міністраў рэспублікі, аб абласным Савеце народных дэпутатаў, Кодэкс Беларускай ССР аб нетрах, Лясны кодэкс і іншыя заканадаўчыя акты.

Умацаванне законнасці — важная практычная задача партыйных і савецкіх органаў, усёй грамадскасці, таму што, як гаварыў таварыш Л. І. Брэжнеў, чым далей мы развіваем савецкае заканадаўства, тым больш трэба клапаціцца аб яго строгім і няўхільным выкананні. У нас, напрыклад, сталі крылатымі словы: план — закон. І гэта сапраўды так. Для кожнага савецкага чалавека выканаць народнагаспадарчы план — абавязак, перавыканаць — гонар.

Тым не менш, як мы бачылі са справаздачнага даклада, планавыя заданні пяцігодкі рэалізаваны ў рэспубліцы не па ўсіх пазіцыях. Мы яшчэ не дабіліся строгага захавання планавай дысцыпліны ва ўсіх звеннях гаспадарчага арганізма. Не зжыты да канца такія негатыўныя з'явы, як прыпіскі, местніцтва, парушэнне вытворчых сувязей, карэкціроўка планаў у бок іх зніжэння, безадказнасць асобных работнікаў.

Маштабныя і складаныя задачы новай пяцігодкі патрабуюць рашучага выкаранення падобных недахопаў. Нам трэба павысіць партыйную патрабавальнасць да кадраў за выкананне ўстаноўленых заданняў, забяспечыць на ўсіх участках работы высокую арганізаванасць, падцягнутасць, дысцыпліну ва ўсіх адносінах.

Велізарнае значэнне для цяперашняга і будучых пакаленняў мае паслядоўнае ажыццяўленне заканадаўства аб зямлі. У нас нямала робіцца для руплівага, гаспадарлівага выкарыстання зямельных рэсурсаў. Дастаткова напомніць аб пераўтварэнні Палесся, наогул аб размаху меліярацыйнага будаўніцтва, культуртэхнічных і іншых работ, дзякуючы якім палепшыўся парадак на зямлі, павысілася яе ўрадлівасць.

Але растуць гарады, развіваюцца прамысловасць і транспарт. Для гэтага, зразумела, патрэбны ўсё новыя і новыя зямельныя плошчы. Аднак трэба ўсяляк процістаяць неабгрунтаванаму заняццю каштоўных зямель, асабліва ворных. Выпадкаў жа такога роду, на жаль, яшчэ нямала.

Галоўнай мэтай у галіне эканомікі наша партыя ставіць павышэнне дабрабыту народа. У справаздачным дакладзе прыведзены пераканаўчыя даныя, якія гавораць аб тым, што за гады дзесятай пяцігодкі ўзровень жыцця працоўных рэспублікі, як і ўсёй краіны, значна вырас. Нямала зроблена ў гэтым напрамку Саветамі. Яны сталі цясней увязваць пытанні эканамічнага і сацыяльнага развіцця, лепш узгадняць і кантраляваць работу прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый рознай ведамаснай падпарадкаванасці. Інакш кажучы, яны ў большай меры, чым раней, выступаюць гаспадарамі становішча на сваёй тэрыторыі. Іменна гэтага і дабіваецца Цэнтральны Камітэт КПСС, ствараючы ўмовы для павышэння ролі і аўтарытэту Саветаў.

Як вядома, вялікая адказнасць ускладзена на Саветы за павелічэнне вытворчасці і паляпшэнне якасці тавараў народнага спажывання. Аб'ём іх выпуску няўхільна расце. Але нават самыя сuцяшальныя лічбы не могуць нас супакойваць, бо яшчэ хутчэй расце попыт, павышаюцца патрабаванні спажыўцоў да асартыменту і якасці вырабаў.

У верасні мінулага года Прэзідыум Вярхоўнага Савета разгледзеў з гэтага пункту гледжання пытанне аб рабоце рэспубліканскага Міністэрства лёгкай прамысловасці. Слоў няма, прадпрыемствы галіны папрацавалі нядрэнна, дабіліся пэўных поспехаў. Разам з тым Пастаянная камісія па прамысловасці Вярхоўнага Савета, якая рыхтавала гэта пытанне, выявіла шмат сур'ёзных недахопаў. Дзеючыя магутнасці часам загружаны не поўнасцю, вялікія страты рабочага часу, спажывецкі попыт вывучаецца слаба. У выніку, нягледзячы на як быццам бы нядрэнны агульны вал, вялікая колькасць трыкатажных, швейных, абутковых прадпрыемстваў не забяспечваюць узгоднены асартымент прадукцыі, пастаўляемай гандлюючым арганізацыям.

Недастаткова ўдзельнічаюць у вытворчасці тавараў масавага спажывання і некаторыя буйныя прамысловыя прадпрыемствы. На аршанскім заводзе «Чырвоны Кастрычнік» удзельная вага такіх тавараў у агульным аб'ёме выпускаемай прадукцыі складае ўсяго 0,2 працэнта, на прадпрыемствах вытворчага аб'яднання «Бабруйскферммаш» — 0,5, на Магілёўскім аўтазаводзе імя С. М. Кірава — 0,7 працэнта.

Кіраўнікам гэтых і раду іншых прадпрыемстваў і аб'яднанняў пара, нарэшце, павярнуцца тварам да важнай агульнадзяржаўнай справы, якой з'яўляецца вытворчасць тавараў культурна-бытавога прызначэння і гаспадарчага ўжытку.

У нашай рэспубліцы ёсць нямала прыкладаў умелай работы саветаў па кааперыраванню сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый рознай ведамаснай падпарадкаванасці на жыллёвае і сацыяльна-культурнае будаўніцтва. У Салігорску такім шляхам за гады дзесятай пяцігодкі ўведзена ў строй каля 336 тысяч квадратных метраў жылля. Пабудаваны кінатэатр, шэсць дзіцячых садоў-ясляў, бальніца з палiклінікай, Дом быту, адзінаццаць магазінаў, кафэ, сталовая. Заканчваецца будаўніцтва Дома піянераў, музычнай школы. Рэльефна відаць плён канцэнтрацыі сіл і сродкаў пад кіраўніцтвам Саветаў і ў многіх іншых хутка растучых гарадах.

Аднак мясцовыя органы ўлады яшчэ не ў поўнай меры выкарыстоўваюць свае правы, каб забяспечыць патрэбны ўзровень будаўніцтва жылля, школ, бальніц, прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. А гэта ж, як кажуць, іх кроўная справа.

Возьмем жыллёвае будаўніцтва. Адзін мільён 900 тысяч чалавек атрымалі новыя кватэры і палепшылі свае жыллёвыя ўмовы за мінулую пяцігодку. Гэта, бясспрэчна, буйное сацыяльнае дасягненне. І ўсё-такі, таварышы, заданні пяцігодкі выкананы ў нас не поўнасцю, асабліва па лініі жыллёва-будаўнічых кааператываў.

Сур'ёзную трывогу выклікае стан жыллёвага будаўніцтва ў вёсцы. Усе вы памятаеце, што ў лютым 1977 года ЦК Кампартыі Беларусі і Савет Міністраў прынялі пастанову па далейшай перабудове сёл і вёсак рэспублікі. У ёй былі вызначаны канкрэтныя заданні па жыллю. На жаль, з году ў год яны не выконваюцца. Утварылася запазычанасць прыкладна ў паўтара мільёна квадратных метраў. Вінаваты ў гэтым як будаўнікі, так і заказчыкі. Аднак вялікую долю віны павінны ўзяць на сябе і Саветы, якія не забяспечылі належны кантроль за ходам будаўніцтва.

Становішча трэба рашуча выпраўляць, памятаючы аб тым, што перабудова вёскі — гэта пытанне велізарнага сацыяльнага значэння, ад вырашэння якога ў вялікай меры будзе залежаць далейшае развіццё нашай сельскай гаспадаркі.

Не ўсё ў нас добра з развіццём сеткі дашкольных, медыцынскіх і культурна-асветных устаноў, прадпрыемстваў камунальнай гаспадаркі, гандлю, службы быту. Так, заданні пяцігодкі па ўводу новых месц у дзіцячых садах і яслях вы-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы